Список использованной литературы
1. Государственный архив общественных объединений Могилевской области (ГАООМО). – Ф. 6622. Оп. 1. Д. 338.

# КІРЫЛА ТУРАЎСКІ ЯК ВОБРАЗ ГОДА МІРУ І СТВАРЭННЯ

**Бялевіч Анастасія (УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, Беларусь)**
**Навуковы кіраўнік – Л. У. Гаўрылавец, канд. гіст. навук, дацэнт**

У навагоднім звароце да беларускага народа 31 снежня 2022 года Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка адзначаў, што «калі мы хочам жыць у міры і бяспецы, то перш за ўсё павінны выхоўваць дзяцей патрыётамі сваёй краіны і выконваць закон, добрасумленна працаваць, а калі хочам жыць у вольнай і незалежнай дзяржаве, то павінны берагчы і абараняць гістарычную памяць, духоўныя каштоўнасці і спрадвечныя традыцыі» [1].

Калі падбіраць гістарычны вобраз для абвешчанага ў нашай краіне Года міру і стварэння, то найбольш прыдатным на гэтую ролю будзе Кірыла Тураўскі. Паэтычны талент, стараннасць, руплівасць, адукаванасць і высокая маральнасць прападобнага Кірылы Тураўскага зрабілі яго вядомым не толькі ў Тураўскім княстве, але і на тэрыторыі ўсёй нашай Радзімы. У 1159 годзе па просьбе тураўскага князя Юрыя Яраслававіча, жыхароў горада Турава Кірыла Тураўскі быў прызначаны кіеўскім мітрапалітам Канстанцінам II епіскапам Тураўскай епархіі.

Знаходзячыся на гэтай пасадзе, Кірыла Тураўскі працягваў сваю літаратурна-асветніцкую дзейнасць і актыўна ўключаўся ў палітычнае жыццё старажытнарускіх княстваў. Падтрымліваючы кіеўскага мітрапаліта Канстанціна II, ён актыўна выступаў супраць спробаў уладзімірскага князя Андрэя Багалюбскага стварыць свабодную, незалежную ад Кіева Уладзімірскую мітраполію і нават выступіў з абвінавачвай прамовай пра кандыдата на кіраўніцтва святара Фёдара пры мітрапалітным двары. У той жа час епіскап К. Тураўскі вёў актыўную перапіску з Андрэем Багалюбскім, у якой асуджаў Фёдара за нізкія маральныя якасці і стараўся перасцерагчы ўладзімірскага князя, павучаў яго як трэба мірна і справядліва кіраваць сваёй зямлёй.

Кірыла Тураўскі добра ведаў гісторыю свайго народа, быў дасведчаным чалавекам адносна палітычнай сітуацыі на беларускіх землях. Усё жыццё падзвіжніка стала як бы бачнай альтэрнатывай бясконцым інтрыгам, сваркам, змовам, княжацкім паходам, якімі была напоўнена гісторыя Старажытнай Русі. Асветнік выкарыстоўваў увесь свой сацыяльны і палітычны ўплыў для ўціхамірвання шматлікіх канфліктаў таго неспакойнага часу. І неабходна адзначыць, што яго ўплыў на вялікіх князёў быў значным.

Сваёй шматграннай духоўнай, маральнай, а таксама літаратурнай дзейнасцю наш суайчыннік далёкага XII стагоддзя, праваслаўны святар



МГПУ им. И. П. Шамякина

Кірыла Тураўскі шырока праславіў сваю Радзіму за яе межамі і адыграў важную ролю ў фарміраванні лепшых бакоў менталітэту ўсходнеславянскіх народаў [2].

Некалькі гадоў таму назад слова «мір» не гучала ў кантэксце чагосьці святога, чагосьці, што патрабуе асабліва беражлівых адносін, у чым кожны чалавек сур'ёзна мае патрэбу. Нашы продкі спакойна ўспрымалі мірнае жыццё як нешта пастаяннае, як здавалася тады, што гэта было жыццё, якое ніхто не мог патрывожыць. Але час у чарговы раз даказваў справядлівасць выказвання, што «тое, што ў нас ёсць, мы – не захоўваем, страціўшы, мы – плачам» [3].

Стварэнне – гэта якасць, што ўласцівая нашаму народу, які з'яўляецца творчым, працавітым і мэтанакіраваным. Неад'емнай рысай кожнага беларуса з'яўляецца імкненне да міру, яго абароны і ўмацавання. Шматлікія ўрокі гісторыі вучаць нас таму, што як цяжка дасягнуць міру і якое гэта шчасце – жыць без войнаў і разбурэнняў. Гэта і жадаў данесці да нас беларускі асветнік Кірыла Тураўскі.

Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Гигин, В. Мир и созидание – заповедь наших предков, которую мы должны свято исполнять и сегодня [Электронный ресурс] / В. Гигин // Беларусь сегодня. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/my-belorusy-mirnye-lyudi-gigin.html. – Дата доступа: 27.03.2023.
2. Лютко, С. Духовное наследие Кирилла Туровского [Электронный ресурс] / С. Лютко // Беларусь сегодня. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/dukhovnoe-nasledie-kirilla-turovskogo.html. – Дата доступа: 27.03.2023.
3. Полынский, А. Год мира и созидания [Электронный ресурс] / А. Полынский // Березинская панорама. – Режим доступа: https://berezino.by/ru/novosti/obshchestvo/item/16534-god-mira-i-sozidaniya. – Дата доступа: 27.03.2023.


## ТВОРЧЕСКИЙ ПУТЬ МИХАЛА КУЛЕШИ


**Бодиловская Елизавета (УО ГГУ им. Ф. Скорины, Беларусь)**
**Научный руководитель – В. В. Цацарин**


Михал Кулеша был одним из первых литографов на территории Великого Княжества Литовского. Ведущий художник-пейзажист своего периода, Кулеша создал образы, которые сейчас являются одними из немногих визуальных записей региона в первой половине XIX в. Благодаря своему многогранному таланту он внес значительный вклад в культуру Беларуси, Польши, Литвы, России и Украины. Все, что создал М. Кулеша, стало достоянием национального и европейского культурного наследия.

Целью работы является анализ творчества Михала Кулеши.

Творчество Михала Кулеши в целом является отзвуком художественного наследия Великого Княжества Литовского. Из его работ сохранились немногие, сейчас они находятся в художественном музее Вильнюса.

К сохранившимся относятся исторические композиции «Атака гусар» и «Гетман», выполненные в 1840-х годах в технике гуаши. В «Атаке гусар»

МГПУ им. И. П. Шамякина